УА «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
ФАКУЛЬТЭТ ФІЗІЧНАГА ВЫХАВАННЯ
КАФЕДРА СПАРТЫЎНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАЎ
БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
УПРАЎЛЕННЕ СПОРТУ І ТУРЫЗМУ
БРЭСЦКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
СЕКТАР СПОРТУ І ТУРЫЗМУ

Репозиторий БрГУ им А.С.Пушкина

# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ: ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

Брэст
«Альтернатива»
2014

УДК [379.8+796.035]-053.5/.81(082)
ББК 74.200.58я43
Г94

Рэдакцыйная калегія:
Ул.П. Люкевіч (старшыня, Брэст), К.І. Белы (Брэст), П. Мазур (Хэлм), І.І. Лосева (Мінск), С. Нікіцін (Седльцэ)

Рэцэнзент:
доктар філасофскіх навук А.С. Лапцёнак

Рэкамендавана да публікацыі кафедрай спартыўных дысцыплінаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна
(пратакол № 8 ад 14 сакавіка 2014 года)

Репозиторий БрГУ им. А.С. Пушкина

Г94 **Гульні** і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: традыцыі і навацыі : зб. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна [і інш.] ; рэдкал.: Ул. П. Люкевіч [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2014. – 124 с.

ISBN 978-985-521-434-3.

У зборніку змешчаны артыкулы даследчыкаў з вышэйшых навучальных установаў Беларусі, Польшчы і Украіны, якія разглядаюць тэарэтычныя і практычныя праблемы культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі.

Матэрыялы, што надрукаваныя ў зборніку, можна выкарыстоўваць у працэсе выкладання гуманітарных дысцыплінаў, фармавання здаровага ладу жыцця, а таксама ў іншых формах працы па выхаванні дзяцей і моладзі.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за граматычную правільнасць, падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, лічбаў, цытат, уласных назваў, прозвішчаў, імёнаў і іншай інфармацыі.

**УДК [379.8+796.035]-053.5/.81(082)**
**ББК 74.200.58я43**

**ISBN 978-985-521-434-3**

© УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна», 2012, 2014
© Афармленне. ПВГУП «Издательство Альтернатива», 2014

УДК 361.856.3(38)
Ул.П. ЛЮКЕВІЧ
Беларусь, Брэст, УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С. Пушкіна»
# ГУЛЬНІ СТАРАЖЫТНАЙ ЭЛАДЫ

**Уводзіны**

Культура правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі ў варунках сучаснага глабалізаванага грамадства вызначаецца шэрагам асаблівасцяў, якія характарызуюць функцыянаванне чалавечай супольнасці на інфармацыйным узроўні развіцця соцыума. Такое становішча рэчаў абумоўлена самымі рознымі акалічнасцямі, якія найчасцей звязваюцца з тэхнічнымі і тэхналагічнымі дасягненнямі людзей у пераважнай большасці накірункаў іх творчай і прафесійнай дзейнасці. Значная частка насельніцтва ператварылася ў пасіўных спажыўцоў разнастайных дабротаў, вытворчасць якіх пастаўлена на канвеер, і сам удзел асобнай адзінкі імкліва звузіўся да такога праблемнага поля, што вызначаецца паміж паняццямі «купляць»» і «не купляць». Падобны падыход у апошнія дзесяцігоддзі стаў набываць выгляд тэндэнцыі дамінавання ў індывідуальнай і грамадскай свядомасці сотняў мільёнаў людзей. Зусім натуральна, што гэта не магло не адбіцца на сістэме выхавання і адукацыі, фармаванні і замацаванні новых звычак, традыцыяў і стэрэатыпаў. Геніяльная ідэя часоў старажытнасці пра станаўленне гарманічна развітой асобы ўсё больш і больш пэўна адыходзіць у нябыт. Тым не менш падаецца важным нагадаць, як распачыналася нараджэнне феномену гульняў у тыя далёкія часы, калі культура Старажытнай Грэцыі на тысячагоддзі наперад вызначала найбольш важныя напрамкі чалавечай жыццёвай дзейнасці. Асобнае месца належыць тут алімпійскай ідэі, якая, здаецца, безальтэрнатыўна паўстае ў якасці самай даўгавечнай глабальнай ідэі ў гісторыі чалавечай думкі. Алімпізм як сацыяльная з'ява ўзнікае раней за рэлігію. Але на ўздыме захаплення Алімпійскімі гульнямі ў іх сучасным увасабленні неабходна пазначыць і тое, што ў старажытнасці яны зусім не былі адзіным прыкладам у дадзеным кірунку, і не толькі яны фармавалі традыцыі, якія дайшлі да нашага часу і сёння рэальна вызначаюцца як узоры выхавання і адукацыі для дзяцей і моладзі ў самых розных сферах, у тым ліку спартыўнай дзейнасці як аднаго з варыянтаў у культуры правядзення вольнага часу.

**Асноўная частка**

Акрамя Алімпійскіх гульняў на тэрыторыі Старажытнай Грэцыі праводзіліся і іншыя спартыўныя спаборніцтвы, якія хоць і саступалі па сваёй папулярнасці алімпійскім, аднак з'яўляліся значнымі падзеямі ў жыцці краіны. Найбольш вядомымі з іх (ці тымі, звесткі пра якія дайшлі да нас) былі Нямейскія, Піфійскія і Істмійскія гульні. Усе гэтыя спаборніцтвы насілі агульнагрэцкі характар, у іх прымалі ўдзел прадстаўнікі розных гарадоў-полісаў.

Нямейскія гульні, якія праводзіліся ў гонар бога Зеўса і лічыліся рэлігійным культам, упершыню адбыліся ў Нямеі (Аргаліда на Пелапанэсе) больш чым праз 200 гадоў пасля пачатку Алімпійскіх гульняў – у 573 годзе да н. э. Пасля гэтага гульні праводзіліся кожныя два гады – на другі год алімпійскага чатырохгоддзя – восенню, на чацвёрты – зімой. Пры раскопках у Нямеі



Репозиторий БрГУ им А.С.Пушкина

знайшлі руіны фундаментаў спартыўных аб'ектаў – стадыёна з трыбунамі для вялікай колькасці гледачоў, а таксама фундаменты шматлікіх пастаялых двароў з карчмамі, лазняў і басейнаў для плавання. У праграме Нямейскіх гульняў былі розныя віды спорту, аднак самымі папулярнымі былі бег, барацьба і пентатлон. Пераможцы ўзнагароджваліся вянкамі з дуба, і нават, як лічаць некаторыя гісторыкі, з плюшча ці сельдэрэя. Арганізатары Нямейскіх гульняў неаднаразова спрабавалі дабіцца захавання на час спаборніцтваў усеагульнага міру ў Эладзе. Аднак нягледзячы на ўсе іх намаганні мір шматразова парушаўся, асабліва спартанцамі [гл.: 1].

Піфійскія гульні праводзіліся ў Факідзе недалёка ад Дэльфаў, на Цырэйскай раўніне, у гонар бога Апалона праз кожныя чатыры гады, на трэці год Алімпіяды. Існуе міф пра тое, што Піфійскія гульні заснаваў Апалон на тым месцы, дзе ён забіў жахлівага змея Піфона. Пра асаблівую сувязь Піфійскіх гульняў з культам Апалона сведчыць і тое, што першапачаткова ў праграму Гульняў уваходзілі толькі мусічныя спаборніцтвы – выступленні музыкантаў, спевакоў, танцораў, апекуном якіх лічыўся сам Апалон. Гістарычная традыцыя даводзіць, што ў 586 годзе да н. э. пасля адной з войнаў паміж грэцкімі гарадамі ў памяць пра загінулых былі ўпершыню праведзены паблізу Дэльфаў спаборніцтвы на калясніцах, а з 582 года да н. э. гэтыя мясцовыя святы ператварыліся ў агульнагрэцкія. З 586 года да н. э. пачалі адлік чатырохгоддзяў -- піфіядаў. Пад уплывам спартанскіх звычаяў удзельнікі спаборніцтваў выступалі аголенымі. У спаборніцтвах стартавалі мужчыны, хлопцы і дзяўчаты. Узнагародай пераможцы спачатку былі яблыкі, пазней – вянкі з галінак лаўравага дрэва, што і да сённяшняга часу застаецца сінонімам самага высокага ганаровага вызначэння [гл.: там сама].

Істмійскія гульні былі арганізаваны ў гонар Пасейдона – уладара мора. Яны праводзіліся ў сасновым гаю ў Істме на Карынфскім перашыйку з 581 года да н. э. кожныя два гады, у першы і трэці год кожнай Алімпіяды, вясной. Праграма складалася з выступленняў флейтыстаў і кіфарэдаў і спартыўных спаборніцтваў: бег, барацьба, гонкі на калясніцах і конныя скачкі. Стартавалі ў іх мужчыны, якіх падзялялі на тры ўзроставыя групы. Пераможцу ўзнагароджвалі вянком з сасновых галінак, а па іншых звестках, – гэта быў вянок з галінак сэлеру, расліны, якая прысвячалася Пасейдону. Карынф, паблізу якога адбываліся гэтыя Гульні, быў багатым і ўплывовым горадам, таму спаборніцтвы заўсёды праходзілі вельмі ўрачыста і прыцягвалі мноства людзей. Як і алімпіёнікаў, пераможцаў Істмійскіх гульняў узвялічвалі паэты, перш за ўсё Піндар і Вакхілід [гл.: там сама].

Трэба заўважыць, што практычна кожны старажытнагрэцкі горад арганізоўваў свае спартыўныя спаборніцтвы. Найчасцей яны мелі лакальны характар і выглядалі, як падрыхтоўка да тых найважнейшых гульняў, якія па прэстыжнасці ішлі адразу за Алімпійскімі гульнямі, а менавіта Нямейскіх, Піфійскіх і Істмійскіх.

Акрамя названых вышэй гульняў на тэрыторыі Старажытнай Грэцыі праводзіліся таксама іншыя спаборніцтвы, пра якія зараз узгадваюць не так часта, але яны тым не менш мелі адпаведны ўплыў на фармаванне алімпійскай ідэі.

Напрыклад, Панафінскія гульні спалучаліся з традыцыйным святам у гонар Афінаў, якое арганізоўвалася на трэці год Алімпіяды. Праходзіла яно

Репозиторий БрГУ имени А.С. Пушкина

падчас жніва. Ад 586 года да н. э. Панафінскія гульні прынялі спартыўны характар і сталі праводзіцца праз кожныя чатыры гады. Спартыўная праграма уключала музычныя і конныя спаборніцтвы. Самай важнай часткаю праграмы лічыўся «лямпададромас» (lampadodromos), альбо бег са знічамі (менавіта адсюль бярэцца добра вядомая зараз традыцыя эстафеты алімпійскага агню ад Алімпіі праз краіны і кантыненты да месца правядзення спаборніцтваў на галоўным стадыёне Гульняў). Мэтаю ўдзельніка было пераадоленне вызначанай адлегласці дыстанцыі такім чынам, каб полымя не згасла. Наступны ўдзельнік павінен быў перадаць паходню чарговаму бегуну сваёй каманды. Спаборнічалі выключна мужчыны ў трох узроставых катэгорыях. Пераможцы атрымлівалі рэчавыя ўзнагароды, сярод якіх былі і каштоўныя амфары чорнага колеру з намаляванымі фігурамі [гл.: 1; 2].

Асобна неабходна пазначыць Герайскія гульні, ці гульні для жанчынаў. Яны арганізоўваліся кожныя чатыры гады ў Алімпіі, але ў іншыя гады, чым Алімпійскія гульні. Спаборніцтвы там адбываліся толькі ў адной дысцыпліне – бегу на дыстанцыі ў 5/6 стадыёну (160,22 м). У іх бралі ўдзел дзяўчаты, якія падзяляліся на тры ўзроставыя групы. Бегалі з распушчанымі валасамі ва убраннях, якія дасягалі каленаў і адкрывалі плечы да самых персяў. У якасці ўзнагароды атрымлівалі вянок з алівы і права выставіць у Алцісе свой асабісты намаляваны партрэт. Некаторыя гісторыкі лічаць, што агон (спаборніцтвы дзяўчатаў) у Алімпіі старэйшы ў часе, чым гульні сярод мужчынаў [гл.: 2; 3].

Варта дадаць, што азначаныя вышэй гульні разам з алімпійскім спаборніцтвамі утваралі непарыўную сувязь, пра што сведчыць факт усталявання тытула Перыядоніка для таго атлета, які падчас аднаго алімпійскага чатырохгоддзя (ці аднаго перыяду) перамагаў у Алімпіі, Нямеі, Факідзе і ў Істміі Карынфскай. Да нашага часу захавалася каля 60 імёнаў такіх трыумфатараў. Сярод іх выключных поспехаў дасягнулі Герадорас з Мегары, які перамагаў дзесяць разоў сярод трубачоў (328–292 гг. да н. э.), а таксама Мілон з Кратону, што шасцірразова быў лепшым у барацьбе (540 г. да н.э. і ў 532–516 гг. да н. э.).

Што датычыцца жанчын, то ім было забаронена з'яўляцца на спартыўных аб'ектах, але гэтая забарона распаўсюджвалася толькі на Алімпійскія гульні. Спаборніцтвы сярод дзяўчатаў падчас Герайскіх гульняў праводзіліся практычна на тых самых стадыёнах, дзе змагаліся мужчыны. Рэлігійна-спартыўныя урачыстасці ў гонар багіні Геры мелі важнае культурнае значэнне. Захаваліся звесткі пра тое, што падчас Піфійскіх гульняў агоны (спаборніцтвы) праводзіліся не толькі сярод хлапцоў, але і сярод дзяўчат. Так, згодна са звесткамі гісторыка Атэнаіаса, у змаганнях на выспе Хіас у барацьбе дзяўчаты выступалі разам з маладымі мужчынамі. Як сцвярджаў Плутарх, ужо ў IX ст. да н. э. у Спарце дзяўчаты павінны былі трэніравацца ў бегу, барацьбе, кіданні дыску і дзіды. Гэта трэба было рабіць дзеля таго, каб будучае дзіця здарова развівалася ва ўлонні здаровай маці [гл: 4].

Адным з найважнейшых дасягненняў філасофіі Старажытнай Грэцыі было фарміраванне глабальнай ідэі гарманічна развітой асобы. На падставе яе ўзнікае паняцце «калакагатыя» (kalos kai agathos – прыгожы і добры), што спалучала прыгажосць фізічную і прыгажосць духоўную. Прычым, kalos акрэслівала прыкметы цела, якія дасягаліся дзякуючы фізічным практыкаванням і спартовай трэніраванасці, а agathoa адносілася да духоўных прыкметаў –



Рэпазіторый БрДУ імя А.С. Пушкіна

най палітыкі, якая з неабходнасцю павінна улічваць усе новыя запыты і выклікі з боку глабальнай супольнасці, што змушае кожную асобу незалежна ад яе індывідуальнасці адпавядаць галоўным узорам і крытэрыям грамадскага развіцця.

Культура правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі ў варунках сучаснага глабалізаванага грамадства вызначаецца шэрагам асаблівасцяў. Тым не менш у працэсе выхавання з'яўляецца магчыма выкарыстоўваць традыцыі, якія фармаваліся на падставе дасягненняў філасофскай думкі Старажытнай Грэцыі, у тым ліку Алімпійская ідэя. Гарманічнае развіццё асобы з'яўляецца адной з галоўных задачаў кожнай дзяржавы. Умелае спалучэнне фізічнага і духоўнага патэнцыялу людзей дазваляе больш пэўна паказаць прыярытэты і накірункі ўздзеяння на моладзевае асяроддзе.

The culture of carrying out free time of children and youth in the conditions of the modern globalized society differs a number of features. Nevertheless in educational process use of traditions which were created on the basis of achievements of philosophical thought of Ancient Greece, including the Olympic idea is possible. Harmonious development of the personality is one of fundamental problems of each state. The skillful combination of physical and spiritual potential of people allows to be defined definitely more in priorities and the directions of impact on the youth environment.

1. Igrzyska nemejskie [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.olimpijski.pl/pl/120,Inne-igrzyska.html. – Дата доступу: 19.03.2014.
2. Heraje [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://historia.gazeta.pl/historia/1,1[illegible],Starozytne_igrzyska_olimpijskie.html#ixzz1kScz2Q87. – Дата доступу: [illegible].
3. Panatenaje [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.olimpijski.pl/pl/120,Inne-igrzyska.html. – Дата доступу: 19.03.2014].
4. Starożytne igrzyska olimpijskie (geneza, trwanie, konkurencje) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.eduteka.pl/doc/starozytne-igrzyska-olimpijskie-geneza-trwanie-konkurencje. – Дата доступу: 19.03.2014.

УДК [illegible]-053.2:2-486.7(438)
А. АНТАС-ЯЩУК, Б. ТРЕНБИЦКА-ПОСТЖИГАЧ
Польша, Седльце, Естественно-Гуманитарный Университет в г. Седльце

## СПОРТИВНАЯ АКТИВНОСТЬ ДЕТЕЙ-ИНВАЛИДОВ В ПОЛЬШЕ

Спорт является одним из ключевых элементов общественной жизни в западной цивилизации. Трудно вообразить сегодня обыденную жизнь, в том числе существование людей с инвалидностью, в мире без спорта. В спортивных занятиях люди участвуют не только для здоровья и физической формы. Благодаря физической активности вырабатываются такие ценности, как: терпимость, дух командного сотрудничества и сила характера. Происходит это даже тогда, когда тренирующиеся этого не осознают. Именно по этой причине спорт является незаменимым образовательным инструментом. Благодаря спортивным занятиям можно привить детям и молодежи ответственное поведение, сформировать сильный характер и идентификацию, а также улучшить общефизическую форму. Это еще и замечательный путь физической и социальной реабилитации для детей и подростков с инвалидностью. Ответственность за введение в мир спорта и создание оптимальных условий

Репозиторий БрГУ им А.С.Пушкина